СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

Бібліятэка АН БССР

# Сталінская ПРАЎДА

Орган Петрыкаўскага РК КП(б)Б

№ 3 | Субота, 10 ліпеня | 1943 г.

**У выніку вайны тыл фашысцкай Германіі грунтоўна падарваны, ваенная эканоміка Германіі сур'ёзна паслаблена, а ў акупіраваных немцамі краінах Еўропы разгараецца ўсенародная барацьба супроць фашысцкіх прыгнятальнікаў**

## З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

На працягу пяці дзён нашы войскі на Орлоўска-Курскім і Белгарадскім напрамках вядуць жорсткія баі з перайшоўшымі ў наступленне буйнымі сіламі пяхоты і танкаў праціўніка, падтрымліваемых вялікай колькасцю авіяцыі. Усе атакі праціўніка адбіты з вялікімі для яго стратамі.

Па няпоўных даных нашымі войскамі на Орлоўска-Курскім і Белгарадскім напрамках, за пяць дзён баёў падбіта і знішчана 2.036 нямецкіх танкаў. Упаветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 904 самалёты праціўніка. Толькі за тры дні знішчана да 30.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

На Орлоўска-Курскім напрамку праціўнік 8 ліпеня ў раёне аднаго населенага пункта на вузкім участку кінуў ў бой тры танкавых і тры пяхотных дывізіі. Часці энскага злучэння вытрымалі 13 жорсткіх атак праціўніка, паследваўшых адна за другой, але не адступілі ні на крок. У гэтых бясплодных атаках праціўнік страціў больш 5.000 салдат і афіцэраў, да 120 танкаў, 33 гарматы, 150 кулямётаў і 210 аўтамашын. На другім участку Орлоўска-Курскага напрамку нашы войскі правялі некалькі паспяховых контратак, выбілі праціўніка з некалькіх населеных пунктаў, занятых ім у першы дзень наступлення.

У баях з праціўнікам чырвонаармейцы і камандзіры праяўляюць выключную стойкасць і ўпартасць. Наша пяхота прапускае нямецкія танкі праз свае баявыя парадкі, потым адразае ад іх пяхоту праціўніка і наносіць ёй знішчальныя ўдары. У гэты час артылерысты, танкісты, бронебойшчыкі выводзяць з строю прарваўшыеся варожыя танкі. Нямецкія войскі пад ударамі нашых байцоў нясуць вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы. На полі боя валяюцца сотні падбітых і спаленых танкаў, многа аўтамашын і самалётаў ворага.

## Налёты нашай авіяцыі

У ноч на 3 ліпеня наша авіяцыя дальняга дзеяння зрабіла налёт на парты Темрук і Керч. Прамымі пападаннямі бомб патоплена некалькі судоў праціўніка. Усе нашы самалёты звярнуліся на свае базы.

У ноч на 5 ліпеня нашы самалёты зрабілі налёт на чыгуначныя вузлы Гомель, Унеча, Рослаўль. Моцнай бамбардыроўцы падвергліся эшалоны праціўніка з войскамі і боепрыпасамі. Усе нашы самалёты звярнуліся на свае базы.

У ноч на 6,7,8 і 9 ліпеня буйныя сілы нашай авіяцыі наносілі ўдары па войсках і тэхніцы праціўніка на Орлоўска-Курскім і Белгарадскім напрамках. Нашы самалёты скінулі вялікую колькасць бомб на чыгуначныя эшалоны ворага, скапленні варожых войск, танкаў, аўтамашын і абозаў, на рачныя пераправы.

Усе нашы самалёты звярнуліса на свае базы.

## Геройскія подвігі совецкіх воінаў

У жорсткім баі быў падбіт самалёт малодшага лейтэнанта таварыша Каласкова. Лётчык зрабіў пасадку ў тылу ворага. Атрад нямецкіх кавалерыстаў кінуўся да месца пасадкі.

Лётчык таварыш Нікалаеў паспяшыў на выручку таварышу і пасадзіў свой самалёт радам з падбітай машынай Каласкова. На вачах у набліжаўшыхся немцаў лётчыкі падпалілі пашкоджаны самалёт і ўдвох паляцелі на машыне Нікалаева. Скора яны благапалучна прызямліліся на сваім аэрадроме.

* * *

Артылерыйская батарэя, дзе камандзірам лейтэнант Дудаура, падверглася бамбардыроўцы з паветра і артылерыйскаму абстрэлу. Потым пяхота і танкі праціўніка атакавалі пазіцыі батарэі.

Артылерысты падпусцілі на блізкую адлегласць ворага і меткім агнём спалілі некалькі цяжкіх танкаў тыпа „Тыгр“. Група артылерыстаў захапіла самаходную гармату праціўніка і пачала з яе страляць па нямецкай пяхоце.

* * *

Чырвонаармеец Крачкоў у баю зрасходваў усе патроны і быў захоплен у палон. Па дарозе ён забіў двух канвіраваўшых яго немцаў, звярнуўся ў сваё падраздзяленне і зноў уступіў ў бой.

## З Совецкай Радзімы

Казахстаннафтакамбінат датэрмінова выканаў вытворчую праграму першага паўгоддзя. Нафтавікі Эмбы далі тысячы тон нафты звыш плана.

У Маскве адкрылася выстаўка трафейнага ўзбраення, захопленага ў баях з немцамі ў 1941-43 г.г.

На Урале, у рэспубліках Сярэдняй Азіі, Башкірыі і іншых усходніх раёнах краіны рабочыя прадпрыемстваў прыступілі да будаўніцтва індывідуальных дамоў. На індывідуальнае будаўніцтва жыллёвых памяшканняў у гэтым годзе асігнавана 160 мільёнаў рублёў.

Аднаўляюцца спаленыя немцамі вёскі ў Нова-Калітвенскім раёне, Варонежскай області. Ужо адбудавана занава звыш 900 дамоў і 14 школ.

# Мы сілы падвоім, мы храбрасць патроім мы ворагаў іх-жа крывёю напоім!

## Што мы зрабілі за год

Роўна год таму назад арганізаваўся наш партызанскі атрад. За гэты час ён вырас у грозную баявую адзінку.

За год сваіх дзеянняў атрад пазялічыўся колькасна, ўзбагацеў узбраеннем і боепрыпасамі, арганізацыйна ўмацаваўся. Пільнасць, стражайшы парадак, арганізаванасць і дысцыпліна сталі асноўнымі ўмовамі, забяспечваючымі нашу барацьбу з нямецка-фашысцкімі акупантамі.

Баявы рахунак атрада з месяца ў месяц папаўняецца. Падрыўныя групы пусцілі пад адкос 18 варожых эшалонаў, у час крушэння якіх знішчана 657 нямецкіх салдат і афіцэраў. Разбурана і ўзарвана 11 кіламетраў чыгункі, 17 мастоў па шасейных і грунтавых шляхах. Пашкоджана тэлеграфна-тэлефоннай сувязі паміж нямецка-паліцэйскімі гарнізонамі на адлегласці 18 кіламетраў.

З засад, паляваннем і ў кароткіх баях знішчана больш 250 гітлераўцаў, падбіта і знішчана 15 нямецкіх аўтамашын, з ліку якіх 2 з боепрыпасамі.

У жорсткай барацьбе з немцамі загартаваліся і выраслі дзесяткі бясстрашных байцоў, для якіх няма больш свяшчэннага абавязка, як абавязак бязлітасна біць немцаў, ачышчаць сваю родную беларускую зямлю ад гітлераўскай погані.

Смеласць і мужнасць, упартасць і стойкасць праяўляюць у баях з нямецкімі акупантамі падрыўнікі Міхась К., Рыгор Г., байцы Андрэй Т., Ілья Я., Якаў М. і дзесяткі другіх. За баявыя заслугі і мужнасць многія байцы і камандзіры падраздзяленняў і ўзводаў прадстаўлены да ўрадавай ўзнагароды.

Уступаючы ў другі год свайго існавання, партызаны нашага атрада абавязаліся узмацніць удары па ворагу, яшчэ бязлітасней і няшчадней біць немцаў да поўнага іх вынішчэння.

ВІКТАР К.— нам. камісара энскага партызанскага атрада.

## Абстралялі варожы эшалон

Група партызан энскага атрада выйшла на абстрэл варожага эшалона. К раніцы дайшлі да палатна чыгункі. Праз некалькі хвілін пачуўся шум ідучага цягніка.

Адзін за другім раздаліся стрэлы з бронебойкі. Па класных вагонах білі з вінтовак і кулямётаў. У выніку абстрэла знішчан паравоз, 13 немцаў забіта і 8 паранена.

Асабліва праявілі сябе камсамольцы Міхаіл Р., Даніла С. і Андрэй С.

НІКАЛАЙ І.— партызан энскага атрада.

## Нямецкай зброяй б'юць немцаў

У энскі партызанскі атрад перайшла з буйнага нямецкага гарнізона група паліцэйскіх. Яны прынеслі з сабой вінтоўкі і ручны кулямёт.

—Фашыстам не ўдалося ашукаць нас—гаворыць адзін з паліцэйскіх.—Мы атрымалі ў немцаў зброю, і гэтай зброяй будзем бязлітасна іх біць. Гэтым самым мы іскупім сваю віну перад радзімай.

СЯРГЕЙ П.

## Фрыцы не даехалі да фронта

З досвіткам мы падпаўзалі да чыгункі. Фрыцы, як ашалелыя, шнyралі то ўзад, то ўперад, як-бы пачуўшы нашу прысутнасць.

Ляжым да самага вечара. На нашых вачах праходзіць некалькі варожых эшалонаў. На сэрцы ўзрастае ўсё большая нянавісць да ворага. Мы рашаем—не адыйсці ад чыгункі пакуль не знішчым варожы эшалон.

Назаўтра раніцою міна была падложана. Спакойна немцы прапускаюць цягнік, але яго ўжо чакае падрыхтаваная намі смерць. Паравоз узыйшоў на міну. Язэп і я пацягнулі за шнур. Міна ўзарвалася. Паравоз, 12 платформ з машынамі і жывой сілай паляцелі пад адкос. Пад абломкамі платформ засталося ляжаць некалькі аўтамашын, танкаў і звыш 20 салдат і афіцэраў.

ПАВЕЛ Д.— падрыўнік энскага атрада.

## Знішчаем нямецкія аўтамашыны

З-за высокага пясчанага насыпа паказалася аўтамашына. Яе чакала міна, пакладзеная камсамольцамі энскага атрада.

Раздаўся ўзрыў. Варожая аўтамашына ўзляцела ў паветра. 27 гітлераўскіх сабак знайшлі сабе смерць на шляху.

ФЁДАР С.

* * *

Група Васіля А. падыйшла да шляху, па якому рухаліся нямецкія аўтамашыны з боепрыпасамі, і жывой сілай.

Падрыўнікі падлажылі міну. Праз некалькі хвілін машына з прадуктамі на поўным хаду найшла на міну. Атрымаўся выбух. Машына знішчана. Ад трох немцаў засталіся кавалкі цела з латкамі вопраткі.

АНДРЭЙ Ш.

## За граніцай

Страты амерыканскіх узброеных сіл спачатку вайны складаюць 91.644 чалавекі, у тым ліку 16.696—забітымі, 21.828—ранеными, 31.579—загінуўшымі без вестак і 21.541—палоннымі.

Акупантамі выдан загад аб мабілізацыі ўсяго мужчынскага насельніцтва Бельгіі ва ўзросце ад 18 да 50 год і ўсіх жанчын ад 18 да 35 год на прымусовыя работы ў Бельгію і Германію.

3 ліпеня загінулі 2 японскіх контр-адміралы.

У Югаславіі адбываюцца моцныя баі паміж югаслаўскімі партызанамі і войскамі акупантаў. Немцы ў радзе раёнаў адступілі. Партызаны адбілі пяць буйных наступленняў акупантаў і перайшлі ў контрнаступленне.

Рэдакцыйная калегія.

Выданне Петрыкаўскага РК КП(б)Б